# Павысіць ролю мясцовых Советаў у кіраўніцтве гаспадарчым і культурным будаўніцтвам

*В. І. Казлоў,*

*Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета Беларускай ССР*

Велічныя задачы паставіў перад партыяй, перад усім совецкім народам XX з'езд Комуністычнай партыі Совецкага Саюза. Паспяховае выкананне гэтых задач, ажыццяўленне зацверджаных з'ездам Дырэктыў па шостаму пяцігадоваму плану з'явіцца новым буйным крокам уперад у развіцці соцыялістычнай эканомікі і культуры, у будаўніцтве комуністычнага грамадства ў нашай краіне.

Вялікі Ленін гаварыў: пераможа толькі той, хто верыць у народ, хто акунецца ў жывую крыніцу народнай творчасці. Наша партыя заўсёды следуе ленінскаму ўказанню. Пры вырашэнні любых задач комуністычнага будаўніцтва партыя нязменна звяртаецца да жывой крыніцы народнай творчасці, нястомна развівае актыўнасць і ініцыятыву працоўных мас.

Народ, кіруемы Комуністычнай партыяй, узброены марксісцка-ленінскай тэорыяй — вось вялікая і непераможная сіла, творца новага жыцця, творца гісторыі. Высока цэніцца ў нашай краіне праца чалавека, стваральніка ўсіх матэрыяльных даброт грамадства. У рашэннях XX з'езда КПСС намечана шырокая праграма далейшага росту матэрыяльнага добрабыту і культурнага ўзроўню працоўных, палепшання ўмоў іх працы і быту.

XX з'езд лічыць, што галоўнай эканамічнай задачай СССР з'яўляецца: дагнаць і перагнаць на шляхах мірнага эканамічнага спаборніцтва ў гістарычна найкарацейшы тэрмін найбольш развітыя капіталістычныя краіны па вытворчасці прадукцыі на душу насельніцтва. Рашаючай умовай поспеху ў гэтым спаборніцтве партыя лічыць павышэнне ўзроўню кіраўніцтва прамысловасцю і сельскай гаспадаркай, усямернае развіццё творчай ініцыятывы і актыўнасці рабочых і калгаснікаў, больш шырокі ўдзел мас у кіраўніцтве дзяржавай, ва ўсёй яе гаспадарча-арганізатарскай дзейнасці.

Праводзячы паслядоўную барацьбу за аднаўленне ленінскіх норм партыйнага жыцця і прынцыпаў калектыўнага кіраўніцтва, наша партыя лічыць неабходным усямерна развіваць совецкі дэмакратызм, умацоўваць сувязі з масамі.

Партыя прымае сур'ёзныя меры па перабудове дзяржаўнага апарату, яго ўдасканаленню і падзешаўленню, па ўмацаванню совецкай законнасці. Увага партыйных арганізацый цяпер звернута на неабходнасць ажыўлення работы Советаў, на рашучае павышэнне іх ролі ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве, у задавальненні штодзённых запатрабаванняў насельніцтва, у справе комуністычнага выхавання працоўных.

Буйныя дзяржаўныя пераўтварэнні, праводзімыя ў цяперашні час партыяй, удасканаленне форм і метадаў дзейнасці совецкіх органаў,

---

**Скарочаная стэнаграма лекцыі, прачытанай у Рэспубліканскай партыйнай школе пры ЦК КПБ 21 мая 1956 года.**

якое абумоўліваецца новай гістарычнай абстаноўкай, накіраваны на тое, каб Советы поўнасцю разгарнулі свае творчыя сілы, мабілізавалі і накіравалі актыўнасць і ініцыятыву мас на паспяховае выкананне заданняў шостага пяцігадовага плана.

### Усямерна развіваць ініцыятыву шырокіх мас

У рашэннях XX з'езда КПСС і ў радзе пастаноў Цэнтральнага Камітэта партыі і Совецкага ўрада ўказваецца на неабходнасць развязаць ініцыятыву мас, прадаставіць больш правоў мясцовым совецкім органам, павысіць іх адказнасць за кіраўніцтва гаспадарчым і культурным будаўніцтвам. Партыя патрабуе рашуча адмовіцца ад празмернай цэнтралізацыі, якая скоўвае ініцыятыву мясцовых органаў улады.

Для таго, каб ясней зразумець, як узрастае роля мясцовых совецкіх органаў і якія патрабаванні прад'яўляюцца да іх у цяперашні час, трэба напомніць аб прынятых у апошні час пастановах Цэнтральнага Камітэта КПСС і Совета Міністраў СССР. Возьмем, к прыкладу, пастанову ЦК КПСС і Совета Міністраў СССР ад 9 сакавіка 1955 года «Аб змяненні практыкі планавання сельскай гаспадаркі». У гэтай пастанове ўстанаўліваецца новы парадак планавання, які адпавядае інтарэсам крутога ўздыму сельскай гаспадаркі, асуджаецца празмерная цэнтралізацыя і бюракратычныя скажэнні ў існаваўшай сістэме планавання сельскай гаспадаркі. Тут з асаблівай сілай падкрэсліваецца роля і значэнне ініцыятывы мас у планаванні сельскагаспадарчай вытворчасці, якое павінна пачынацца непасрэдна ў калгасах, МТС і соўгасах.

Новы парадак планавання, які дазваляе творча падыйсці да пытання аб тым, як атрымаць найбольшую колькасць прадукцыі з адзінкі зямельнай плошчы пры найменшых затратах, патрабуе ад партыйных і совецкіх органаў уважліва разабрацца са становішчам спраў у кожным калгасе і соўгасе, глыбока ўнікнуць у іх работу, параіцца з перадавымі людзьмі калгаснай вёскі. Гэта ў велізарнай ступені павышае ролю мясцовых Советаў і разам з тым павялічвае іх адказнасць за ажыццяўленне дырэктыў партыі і ўрада па сельскай гаспадарцы. Аднак ёсць сігналы аб тым, што некаторыя вышэйстаячыя арганізацыі прабуюць парушыць новы парадак планавання і навязваюць калгасам змяненні ў планах без уліку магчымасцей калгасаў. З такімі фактамі трэба весці самую рашучую барацьбу.

Пасля ліпеньскага Пленума ЦК КПСС, на якім былі разгледжаны пытанні ўздыму прамысловасці і яе далейшага тэхнічнага ўдасканалення, Советам Міністраў СССР 9 жніўня 1955 года была прынята пастанова «Аб расшырэнні правоў дырэктараў прадпрыемстваў». Гэтае рашэнне дае магчымасць больш шырока разгарнуць творчую ініцыятыву работнікаў прадпрыемстваў у справе ўсямернага выкарыстання наяўных рэзерваў вытворчасці. Яно мае на ўвазе ліквідацыю залішняй цэнтралізацыі ў вырашэнні гаспадарчых пытанняў і забеспячэнне большай самастойнасці і аператыўнасці ў кіраўніцтве прадпрыемствамі. Совет Міністраў СССР даў больш шырокія правы дырэктарам прадпрыемстваў у галіне планавання, капітальнага будаўніцтва і рэканструкцыі прадпрыемстваў, рэалізацыі матэрыяльных каштоўнасцей, набыцці абсталявання, інвентару і розных матэрыялаў. Дырэктары прадпрыемстваў маюць права больш самастойна вырашаць пытанні штатаў, заработнай платы, фінансавання, выкарыстання фонду прадпрыемства для палепшання культурна-бытавых умоў работнікаў і ўдасканалення вытворчасці.

Важнейшае значэнне для ўздыму сельскай гаспадаркі маюць пастановы Цэнтральнага Камітэта КПСС і Совета Міністраў СССР ад

6 сакавіка 1956 года «Аб Статуце сельскагаспадарчай арцелі і далейшым развіцці ініцыятывы калгаснікаў у арганізацыі калгаснай вытворчасці і кіраванні справамі арцелі» і «Аб штомесячным авансаванні калгаснікаў і дадатковай аплаце працы ў калгасах». У гэтых рашэннях з усёй сілай падкрэсліваецца, што стварэнне вышэйшай прадукцыйнасці працы і далейшае ўмацаванне ў калгасах новай грамадскай дысцыпліны могуць быць дасягнуты толькі на аснове сапраўднай самадзейнасці і актыўнага ўдзелу калгаснікаў і калгасніц у кіраванні гаспадаркай арцелі.

Між тым у радзе раёнаў наглядаюцца факты парушэння калгаснай дэмакратыі з боку партыйных, савецкіх і сельскагаспадарчых органаў. Калгасам нярэдка навязваюцца такія арганізацыйныя формы і гаспадарчыя нарматывы, якія не адпавядаюць канкрэтным умовам вытворчасці і ўзроўню развіцця гаспадаркі, часта зверху рэгламентуюцца такія пытанні ўнутранага жыцця калгаса як арганізацыя брыгад і звенняў, нарміраванне і аплата працы калгаснікаў, вызначэнне абавязкаў брыгадзіраў і іншых службовых асоб калгасаў. Часта забываюць тое асноўнае палажэнне, што сельскагаспадарчая арцель — гэта калектыўная гаспадарка сялян, якія добраахвотна аб'едналіся, і што самі члены калгаса павінны распараджацца маёмасцю і прадуктамі арцелі, накіроўваць дзейнасць калгаса ў адпаведнасці з законамі Совецкай улады, рашэннямі партыі і ўрада, у інтарэсах дзяржавы, калгасаў і калгаснікаў.

Цэнтральны Камітэт КПСС і Совет Міністраў СССР рэкамендуюць калгасам самім дапоўніць і змяніць асобныя палажэнні прынятага Статута сельскагаспадарчай арцелі з улікам мясцовых канкрэтных умоў. Сюды ўваходзяць такія пытанні, як устанаўленне размераў прысядзібных участкаў калгасных двароў, колькасць жывёлы, якая знаходзіцца ў асабістым карыстанні калгаснікаў, абавязковы мінімум працадзён, увядзенне штомесячнага авансавання. Няправільна, калі рашэнні агульных сходаў калгаснікаў аб выключэнні членаў арцелі з калгасаў, змяншэнні размераў прысядзібных участкаў і некаторых іншых пытаннях адмяняюцца райвыканкомамі без ведама членаў сельскагаспадарчых арцелей. Гэта дае повад нядбайным калгаснікам не лічыцца з думкай і інтарэсамі ўсяго калектыву, прыніжае ролю агульных сходаў і зніжае адказнасць калгаснікаў за прынятыя імі рашэнні. Таму, падкрэсліваецца ў пастанове ЦК КПСС і Совета Міністраў СССР, было-б мэтазгодней, каб скаргі калгаснікаў аб выключэнні з калгаса, змяншэнні размера прысядзібнага ўчастка і па іншых пытаннях, паступаючыя ў райвыканкомы, паўторна разглядаліся агульным сходам калгаснікаў, пастанова якога пасля гэтага з'яўлялася-б канчатковай. Калгаснікам рэкамендуецца самім вызначыць парадак разгляду і вырашэння пытанняў калгаснага жыцця на агульных сходах, на сходах упаўнаважаных і давераных асоб, выбіраемых калгаснікамі, на брыгадных сходах.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы